# Пісьменнікі, дзеячы мастацтва – юбіляры 2022 года

## Студзень

**1 – Каршукоў Яўген** (1932, в. Давыдовічы, Калінк. р-н – 2018), пісьменнік, перакладчык – 90 гадоў з дня нараджэння

**1 – Хвалей Яўген** (1947, в. Белькаўшчына, Стаўб. р-н), паэт, крытык, публіцыст – 75 гадоў з дня нараджэння

**3 – Толкін Джон** (1892-1973), англійскі пісьменнік жанра фэнтэзі – 130 гадоў з дня нараджэння

**9 – Шашалевіч Васіль** (1897, в. Мхінічы, Краснапол. р-н - 1941), драматург, пісьменнік, перакладчык – 125 гадоў з дня нараджэння

**14 – Вярба Вера (сапр. Сакалова Гертруда)** (1942, в. Высокі Гарадзец, Талач. р-н - 2012), паэтэса, аўтар шэрага зборнікаў вершаў і паэм для дарослых і дзяцей, перакладчыца – 80 гадоў з дня нараджэння

**15 – Васілеўская Галіна** (1927, г. Клічаў - 2017), пісьменніца, публіцыст, аўтар твораў для дзяцей і юнацтва – 95 гадоў з дня нараджэння

**15 – Дуброва Мікалай** (1952, в. Бярозаўка, Мазыр. р-н - 2017), мастак, які працаваў у станкавай і кніжнай графіцы, акварэльным жывапісе, педагог, кавалер ордэна свяціцеля Кірылы Тураўскага II ступені – 70 гадоў з дня нараджэння

**16 – Захлеўны Леанід** (1947, г. Гродна), кампазітар, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны – 75 гадоў з дня нараджэння

**18 – Мілн Алан** (1882-1956), англійскі пісьменнік-казачнік, паэт – 140 гадоў з дня нараджэння

**20 – Шырма Рыгор** (1892, в. Шакуны, Пруж. р-н – 1978), харавы дырыжор, фалькларыст, музычны і грамадскі дзеяч, публіцыст, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 130 гадоў з дня нараджэння

**23 – Манэ Эдуард** (1832-1883), французскі мастак – 190 гадоў з дня нараджэння

**25 – Шышкін Іван** (1832-1898), расійскі мастак-пейзажыст – 190 гадоў з дня нараджэння

**27 – Кэрал Льюіс** (1832-1898), англійскі матэматык, філосаф і пісьменнік-казачнік – 190 гадоў з дня нараджэння

**27 – Казакова Рыма** (1932-2008), расійская паэтэса – 90 гадоў з дня нараджэння

**28 – Катаеў Валянцін** (1897-1986), расійскі пісьменнік, паэт, драматург – 125 гадоў з дня нараджэння

## Люты

**7 – Дзікенс Чарльз** (1812-1870), англійскі пісьменнік – 210 гадоў з дня нараджэння

**11 – Орда Напалеон** (1807-1883), кампазітар, піяніст, педагог, мастак, творчасць якога звязана з мастацкім жыццём Беларусі, Францыі, Польшы, іншых краін свету – 215 гадоў з дня нараджэння

**14 – Звонак Алесь (сапр. Пётр)** (1907, г. Мінск - 1996), паэт, перакладчык, крытык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 115 гадоў з дня нараджэння

**14 – Стральцоў Міхась (Міхаіл)** (1937, в. Сычын, Слаўгар. р-н - 1987), пісьменнік, перакладчык, крытык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы – 85 гадоў з дня нараджэння

**16 – Мурашка Рыгор** (1902, в. Бязверхавічы, Слуцкі р-н - 1944), пісьменнік, крытык – 120 гадоў з дня нараджэння

**17 – Мальер Жан** (1622-1673), французскі драматург і акцёр – 400 гадоў з дня нараджэння

**18 – Савіцкі Міхаіл** (1922-2010, в. Звянячы, Талач. р-н), жывапісец, народны мастак Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, Герой Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння

**21 – Фінберг Міхаіл** (1947, г. Мазыр), дырыжор, педагог, кіраўнік заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь "Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі", заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння

**23 – Пісьменкоў Алесь (Аляксандр)** (1957, в. Іванаўка, Касцюк. р-н - 2004), паэт, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова – 65 гадоў з дня нараджэння

**26 – Гюго Віктор** (1802-1885), французскі пісьменнік – 220 гадоў з дня нараджэння

## Сакавік

**10 – Гарун Алесь (сапр. Прушынскі Аляксандр)** (1887, былы фальв. Новы Двор; цяпер у межах г. Мінска - 1920), пісьменнік, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху – 135 гадоў з дня нараджэння

**10 – Гамолка Мікола (Мікалай)** (1922, в. Брынёў, Петрык. р-н - 1992), пісьменнік, драматург, перакладчык – 100 гадоў з дня нараджэння

**15 – Распуцін Валянцін** (1937-2015), расійскі пісьменнік, публіцыст – 85 гадоў з дня нараджэння

**20 – Жычка Хведар** (1927, п. Марс, Жлоб. р-н - 2007), пісьменнік, перакладчык – 95 гадоў з дня нараджэння

**21 – Чукоўскі Карней** (1882-1969), расійскі паэт і літаратуразнаўца – 140 гадоў з дня нараджэння

## Красавік

**15 – да Вінчы Леанарда** (1452–1519), італьянскі мастак, вучоны, вынаходнік – 570 гадоў з дня нараджэння

**19 – Прокша Леанід** (1912, г. Полацк - 1994), пісьменнік, журналіст, аўтар мастацкай прозы для дарослых і дзяцей, нарысаў – 110 гадоў з дня нараджэння

**19 – Каверын Веніямін** (1902-1989), расійскі пісьменнік, ваенны карэспандэнт – 120 гадоў з дня нараджэння

## Май

**10 – Панізнік (Панізьнік) Сяргей** (1942, Мёрскі р-н), паэт, аўтар шэрага паэтычных зборнікаў (у т. л. для дзяцей), перакладчык – 80 гадоў з дня нараджэння

**11 – Баравікова Раіса** (1947, в. Пешкі, Бяроз. р-н), паэтэса, празаік, перакладчык, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова, Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння

**12 – Бароўскі Анатоль** (1942, в. Крушнікі, Мазыр. р-н), празаік, публіцыст, паэт – 80 гадоў з дня нараджэння

**20 – Пушча Язэп (сапр. Плашчынскі Іосіф)** (1902, в. Каралішчавічы, Мін. р-н - 1964), паэт, асобныя творы якога пакладзены на музыку, перакладчык, крытык – 120 гадоў з дня нараджэння

**30 – Ашанін Леў** (1912-1996), расійскі паэт – 110 гадоў з дня нараджэння

**31 – Паўстоўскі Канстанцін** (1892-1968), расійскі пісьменнік – 130 гадоў з дня нараджэння

## Чэрвень

**7 – Герчык Міхаіл (Майсей)** (1932, г. Бабруйск - 2008), пісьменнік, публіцыст – 90 гадоў з дня нараджэння

**18 – Ганчароў Іван** (1812-1891), расійскі пісьменнік – 210 гадоў з дня нараджэння

**28 – Рубенс Пітэр Паўль** (1577-1640), фламандскі жывапісец эпохі барока – 445 гадоў з дня нараджэння

## Ліпень

**2 – Вагнер Генрых** (1922-2000), кампазітар, педагог, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння

**2 – Купала Янка (сапр. Луцэвіч Іван)** (1882, в. Вязынка, Маладзеч. р-н - 1942), паэт, драматург, перакладчык, класік беларускай літаратуры, народны паэт Беларусі – 140 гадоў з дня нараджэння

**24 – Дзюма Аляксандр (бацька)** (1802-1870), французскі пісьменнік і драматург – 220 гадоў з дня нараджэння

## Жнівень

**4 – Брыль Янка (Іван)** (1917-2006), пісьменнік, перакладчык, публіцыст, народны пісьменнік Беларусі, класік беларускай літаратуры – 105 гадоў з дня нараджэння

**5 – Самуйлёнак Эдуард** (1907-1939), пісьменнік, драматург, журналіст – 115 гадоў з дня нараджэння

**14 – Галсуорсі Джон** (1867-1933), англійскі празаік, драматург і паэт, Нобелеўскі лаўрэат – 155 гадоў з дня нараджэння

**23 – Панчанка Пімен** (1917-1995), паэт, перакладчык, дзяржаўны дзеяч, народны паэт Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння

## Верасень

**5 – Талстой Аляксей Канстанцінавіч** (1817-1875), расійскі паэт, пісьменнік і драматург – 205 гадоў з дня нараджэння

**11 – О'Генры** (1862-1910), амерыканскі пісьменнік – 160 гадоў з дня нараджэння

**17 – Танк Максім (сапр. Скурко Яўген)** (1912, в. Пількаўшчына, Мядзел. р-н - 1995), народны паэт Беларусі, грамадскі і дзяржаўны дзеяч – 110 гадоў з дня нараджэння

**25 – Фолкнер Уільям** (1897-1962), амерыканскі пісьменнік, Нобелеўскі лаўрэат – 125 гадоў з дня нараджэння

**29 – Сервантэс Мігель** (1547-1616), іспанскі пісьменнік – 475 гадоў з дня нараджэння

## Кастрычнік

**7 – Пташнікаў Іван** (1932, Лагойскі р-н - 2016), пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа – 90 гадоў з дня нараджэння

**10 – Дранько-Майсюк Леанід** (1957, Давыд-Гарадок), паэт – 65 гадоў з дня нараджэння

## Лістапад

**1 – Верамейчык Уладзімір** (1937, Брагінскі р-н. - 1999), паэт, публіцыст – 85 гадоў з дня нараджэння

**3 – Маршак Самуіл** (1887-1964), расійскі пісьменнік, перакладчык – 135 гадоў з дня нараджэння

**3 – Колас Якуб (сапр. Міцкевіч Канстанцін)** (1882, в. Акінчыцы (цяпер у межах г. Стоўбцы) Мінскай вобласці - 1956), празаік, грамадскі дзеяч, вучоны, педагог, народны паэт Беларусі, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы – 140 гадоў з дня нараджэння

**6 – Мамін-Сібірак Дзмітрый** (1852-1912), расійскі празаік і драматург – 170 гадоў з дня нараджэння

**14 – Ліндгрэн Астрыд** (1907-2002), шведская пісьменніца – 115 гадоў з дня нараджэння

**29 – Шах Соф'я** (1947, в. Лесец, Калінкав. р-н), паэтка – 75 гадоў з дня нараджэння

**30 – Свіфт Джанатан** (1667-1745), англійскі пісьменнік – 355 гадоў з дня нараджэння

## Снежань

**22 – Успенскі Эдуард** (1937-2018), расійскі пісьменнік – 85 гадоў з дня нараджэння